Репозиторий ВГУ

УДК 316.722:94(476)“18/19”

# Стадыі нацыятворчасці ў кантэксце сацыякультурнага развіцця Беларусі ў XIX–XX стагоддзях

***Лысак К. Ф.***
*Установа адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, Мінск*

*У эпоху існавання нацыянальных дзяржаў нацыятворчасць з’яўляецца асноўным фактарам сацыякультурнага развіцця грамадства. Нягледзячы на высокі ўзровень глабалізацыйных і інтэграцыйных працэсаў катэгорыя “нацыі” працягвае заставацца вядучым сродкам атаясамлення індывідам сябе з пэўнай палітычнай, сацыяльнай і культурнай прасторай. Пры гэтым сучасныя нацыі – з’явы адносна нядаўняга часу: яны пачалі ўзнікаць у працэсе грунтоўных палітычных і эканамічных пераўтварэнняў у канцы XVIII – пачатку XIX стагоддзя. Менавіта ў гэты перыяд беларускі народ стаў успрымацца як самастойны суб’ект культуры, што паспрыяла актывізацыі на беларускіх землях нацыятворчых працэсаў, мэтамі якіх было дасягненне культурнай гамагеннасці, сацыяльнай цэласнасці, здабыццё палітычнай аўтаноміі. Вылучэнне асобных стадый нацыятворчасці на Беларусі з наступным выяўленнем на кожным з іх дамінуючых аспектаў сацыякультурнага развіцця паспрыяе больш дасканаламу асэнсаванню асаблівасцей гістарычных працэсаў, адметнасцей беларускай культуры.*

***Ключавыя словы:*** *нацыя, нацыятворчасць, сацыякультурнае развіццё.*

*(Искусство и культура. – 2017. – № 1 (25). – С. 68–73)*

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: kirill.lysack2015@yandex.ru – К. Ф. Лысак*

# Stages of Nation Bildung in the Context of Social and Cultural Development of Belarus in the XIX–XX Centuries

***Lysak K. F.***
*Educational Establishment "Belarusian State University of Culture and Arts", Minsk*

*In the era of the nation states nation building is a major factor of social and cultural development of society. Despite the high level of globalization and integration processes, the category of "nation" continues to be a leading means of identifying the individual himself with a particular political, social and cultural space. At the same time, the phenomenon of the modern nation relatively recently, they began to arise through the process of political and economic reforms in the late XVIII – early XIX century. During this period the Belarusian people are perceived as an independent subject of culture, which contributed to the intensification in Belarusian lands of the strategy of nation-building processes, the goals of which was to achieve cultural homogeneity, social integrity, gaining political autonomy. Selection of individual stages of nation building in Belarus followed by the discovery on each of these aspects of the dominant social and cultural development, contributes to a more perfect understanding of features of historical processes on the territory of Belarus, the Belarusian cultural features.*

***Key words:*** *nation, nation building, social and cultural development.*

*(Art and Culture. – 2017. – № 1 (25). – P. 68–73)*

На сённяшні дзень адметнасцю актуальнай палітычнай і сацыяльна-эканамічнай сітуацыі з'яўляецца стварэнне і функцыянаванне наддзяржаўных утварэнняў, актыўныя інтэграцыйныя і глабалізацыйныя працэсы. Падобныя тэндэнцыі выклікаюць неабходнасць стварэння камунікацыйнай прасторы, якая ўключае ў сябе агульную мову, супольныя каштоўнасныя арыентацыі, нормы і правілы паводзін, што можа прывесці да думкі аб зніжэнні разам з роляй нацыянальных дзяржаў і ролі нацыянальных культур. Але падзеі ў сучасным свеце паказваюць, наколькі складанай можа быць адмова ад уласных культурных характарыстык. Нацыянальная дзяржава працягвае заставацца як асноўным суб'ектам геапалітыкі, так і істотным фактарам рэгулявання сацыяльных, эканамічных і культурных працэсаў унутры краіны. Такім чынам, вылучэнне асаблівасцей паходжання, станаўлення і развіцця нацыянальнай супольнасці пэўнай краіны з'яўляецца неабходным для больш глыбокага асэнсавання накірункаў яе далейшага сацыякультурнага развіцця.

Мэта даследавання – вылучэнне стадый і перыядаў нацыятворчасці падчас фарміравання беларускай нацыянальнай супольнасці з выяўленнем у іх межах дамінуючых аспектаў сацыякультурнага развіцця.

**Аспекты сацыякультурнага развіцця.** Перыяд XIX–XX стагоддзя з'яўляецца вызначальным у гісторыі нашага народа ў дачыненні да паўстання сучаснай беларускай нацыі і набыцця ўласнай дзяржаўнасці. У гэты час нацыятворчыя працэсы выклікалі на нашай зямлі не менш істотныя змены ў сацыякультурным працэсе, чым у блізкіх і далёкіх суседзяў. Але спецыфіка гісторыка-культурных умоў развіцця беларусаў, знаходжанне на мяжы сутыкнення дзвюх буйных цывілізацый вызначылі асаблівасці ўсіх этапаў нацыятворчых працэсаў. Мэтамі нацыятворчасці з'яўляецца пашыранае сярод прадстаўнікоў супольнасці ўсведамленне сваёй культурнай гамагеннасці і адметнасці ад іншых грамадстваў, а таксама набыццё ўласнай дзяржаўнасці і поўная рэалізацыя ў яе межах свайго палітычнага, эканамічнага і духоўнага патэнцыялу. Гэта немагчыма без цеснага ўзаемадзеяння народа як носьбіта традыцыйнай культуры і культуратворчых эліт. Нацыятворчасць выклікае змены ў галіне размеркавання і ажыццяўлення ўлады, змяняе сацыяльны статус прадстаўнікоў супольнасці і нараджае новыя камунікацыйныя магчымасці, спалучаецца з пераходам ад аграрнага да індустрыяльнага тыпу вытворчасці, а таксама спрыяе стварэнню, захаванню і распаўсюджванню нацыянальнай культуры. Такім чынам, неабходна вылучыць *сацыяльны*, *эканамічны*, *палітычны* і *духоўны* аспекты сацыякультурнага развіцця. Кожны з іх будзе мець адметны прыярытэт і змест на розных этапах нацыятворчасці. З гэтага вынікае, што выяўленне асаблівасцей уплыву нацыятворчых працэсаў на кожны з аспектаў жыццядзейнасці грамадства дазволіць вылучыць адметнасць сацыякультурнага развіцця беларускай нацыі ў перыяд яе станаўлення.

**Стадыі і перыяды нацыятворчасці ў Беларусі. Цікавасць да народнай культуры як пачатак нацыятворчых працэсаў.** Абапіраючыся на канцэпцыю трох стадый пераходу этнічнай супольнасці да нацыі, прапанаваную чэшскім даследчыкам Міраславам Хрохам (стадыя А – развіццё нацыянальнай культуры, стадыя В – набыццё грамадзянскіх правоў і палітычнага самакіравання, стадыя С – стварэнне завершанай сацыяльнай структуры) [1, с. 125], якая, на нашу думку, найбольш дакладна адлюстроўвае станаўленне нацыянальных супольнасцей ва ўсходняй Еўропе, мы можам вылучыць пэўныя стадыі нацыятворчасці ў Беларусі, раскрыць іх змест і адметнасць. Аднак кожная з гэтых стадый у кантэксце

Репозиторий БГУКИ

сацыякультурнага развіцця на беларускіх землях мае неаднародны характар. Такім чынам, вызначаныя этапы прадстаўлены некалькімі перыядамі.

У межах стадыі А (развіццё нацыянальнай культуры) неабходна вылучыць: 1) *перыяд дзейнасці таварыстваў Філаматаў і Філарэтаў, 2) перыяд станаўлення навуковага беларусазнаўства і 3) нараджэнне беларускай літаратуры.* Першы перыяд – дзейнасць таварыстваў Філаматаў і Філарэтаў, звязаны з функцыянаваннем Віленскага ўніверсітэта з 1803 па 1832 год. Шмат студэнтаў гэтай навучальнай установы займаліся вывучэннем асаблівасцей беларускага краю. Яны кіраваліся, у першую чаргу, ідэямі гуманізму і рамантызму. Удзельнікамі суполак былі Тамаш Зан, Адам Міцкевіч, Ян Чачот і іншыя. Асноўныя іх інтарэсы – літаратура, філасофія і гісторыя. Але асаблівую цікавасць яны праяўлялі да мовы, традыцый, асаблівасцей быту і гісторыі мясцовага беларускага насельніцтва. Таксама ўдзельнікі таварыства займаліся літаратурнай творчасцю.

Такім чынам, першая спроба асэнсавання духоўнай культурнай спадчыны беларускага народа праз дзейнасць членаў таварыстваў зрабіла беларусаў "прысутнымі" ў тагачасным культурным, сацыяльным і палітычным дыскурсе не толькі былой Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі, але і ўсяго свету. Беларускі народ пачаў успрымацца як асобны суб'ект з уласнымі культурнымі характарыстыкамі, адрозны як ад палякаў, так і ад рускіх, які мае права на самастойнае існаванне. Менавіта ў гэты перыяд пачынае выкрышталізоўвацца беларуская нацыянальная ідэя, якая праз некалькі дзесяцігоддзяў стане падмуркам для паўнавартаснага нацыянальнага руху.

Другі перыяд – гэта станаўленне навуковага беларусазнаўства. Пасля інкарпарацыі беларускіх земляў у склад Расійскай імперыі востра паўстала пытанне пра неабходнасць доказаў прыналежнасці беларусаў да агульнарускага племені: у апошнія гады існавання Рэчы Паспалітай насельніцтва ўсходніх земляў дзяржавы ўспрымалася як адно з этнаграфічных адгалінаванняў палякаў. Моцны ўплыў каталіцызму і паланізаванай шляхты ставіў пад пагрозу самабытнасць беларускага народа. Змена палітычных і культурных элітаў, пашырэнне праваслаўя і сістэматызацыя этнаграфічных і лінгвістычных дадзеных павінны былі пазбавіць беларускія землі польскага ўплыву. У параўнанні з іншымі куткамі Расійскай імперыі, на Беларусі была назапашана найбольшая колькасць фалькл орнага матэрыялу. Важную ролю ў даследаванні культуры беларусаў адыграла стварэнне Рускага геаграфічнага таварыства. Адным з пачынальнікаў беларускай археалогіі, фалькларыстыкі, этнаграфіі і дыялекталогіі быў ураджэнец Мінскай губерні Зарыян Даленга-Хадакоўскі (1784–1825). Дзякуючы сваім даследаванням ён адным з першых канстатаваў самабытнасць беларускай культуры, вызначыў тэрыторыю распаўсюджвання беларускай мовы [2, с. 141]. Свой унёсак у вывучэнне асаблівасцей беларускай культуры зрабілі гісторык і археограф Іван Грыгаровіч (рукапісы "Слоўніка заходнерускай гаворкі" (літары А, Б, В) і "Збору слоў літоўска-рускай (беларускай гаворкі"), Адам Ганоры Кіркор ("Этнаграфічны погляд на Віленскую Губерню"), Іван Насовіч ("Словарь белорусского наречия") і іншыя. Такім чынам, перыяд станаўлення навуковага беларусазнаўства вызначаецца глыбокімі этнаграфічнымі даследаваннямі народнай беларускай культуры, што дазволіла стварыць першыя слоўнікі беларускай мовы, вылучыці адметнасць гістарычнага шляху беларусаў і яго адрозненне ад суседніх дзяржаў.

Вывучэнне беларускай мовы, з'яўленне прысвечаных ёй навуковых прац спрыяла стварэнню беларускамоўных пісьмовых твораў. Такім чынам, трэцім перыядам на этапе першапачатковага развіцця нацыянальнай культуры стала нараджэнне беларускай літаратуры. У 1846 годзе ў Вільні пабачыў свет першы твор Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча – беларуская камічная опера "Сялянка" ("Ідылія"). У 50-я гады В. Дунін-Марцінкевіч займаўся стварэннем вершаваных апавяданняў ("Вечарніцы", "Гапон"), а таксама перакладчыцкай дзейнасцю. Менавіта ён першым пераклаў паэму А. Міцкевіча "Пан Тадэвуш" на беларускую мову. Гэта было спробай увядзення ў кантэкст гісторыі беларускага народа апісання жыцця тагачасных шляхецкіх эліт і сцвярджэння сацыяльнай роўнасці ўсіх слаёў грамадства з мэтай іх кансалідацыі, да чаго ў сваёй творчасці заўсёды імкнуўся Дунін-Марцінкевіч. Трэба адзначыць, што ў пачатку і сярэдзіне XIX стагоддзя ідэя беларускай дзяржаўнасці не была настолькі выразнай. Прадстаўнікі першага пакалення беларускай інтэлігенцыі з'яўляліся прыхільнікамі ідэі польскага федэралізму. Аднак В. Дунін-Марцінкевіч быў адным з першых, хто ўспрымаў беларусаў і беларускую культуру роўнай з іншымі. Такім чынам, ва ўмовах крышталізацыі беларускай нацыянальнай ідэі, адсутнасці ўласнай дзяржаўнасці, эканамічны, палітычны і сацыяльны аспекты сацыякультурнага развіцця маюць другасны характар. Актуальнасць набывае *духоўны аспект*, адметнасць народнай культуры беларусаў. Сістэматызацыя ведаў па мове, гісторыі і фальклоры прывяла да стварэння першых твораў беларускай літаратуры. Азначаныя працэсы паўплывалі на прызнанне беларусаў у якасці самастойнага калектыўнага суб'екта гісторыі фарміравання ўласнай культуратворчай эліты, крышталізацыю беларускай нацыянальнай ідэі (аўтаномія, сацыяльнае адзінства, культурная тоеснасць).

**Ад ідэі аўтаноміі да набыцця дзяржаўнасці.** Стадыя В (набыццё грамадзянскіх правоў і палітычнага самакіравання) уключае ў сябе *перыяд*



Репозиторий ВГУ

*нараджэння ідэі аўтаноміі, “нашаніўскі” перыяд, перыяд станаўлення дзяржаўнасці.* Пачаткам стадыі B з’яўляецца сцвярджэнне ў публічнай прасторы ідэі пра неабходнасць аўтаноміі беларускага народа. Гэты перыяд пачынаецца са з’яўлення першага нумара часопіса “Гоман” (1884), выдадзенага ў сталіцы Расійскай імперыі так званай “Беларускай групай”, якая належала да арганізацыі “Народная воля”. У групу ўваходзілі ўраджэнцы Віцебшчыны і Віленшчыны. Адметнасцю гэтага часу лічацца дзейнасць суполак асветніцкага ці палітычнага (пераважна, народніцкага, пасля сацыял-рэвалюцыянерскага) характару як на Беларусі, так і ў іншых буйных гарадах Расійскай імперыі. Яны займаліся не толькі вывучэннем і трансляцыяй народнай культуры, але і асвятлялі вострыя эканамічныя і палітычныя пытанні. На беларускіх землях вучнёўскія гурткі пачалі ствараецца яшчэ ў першай палове 80-х гг. Пад уплывам дзейнасці беларускага пісьменніка Альгерда Абуховіча такі гурток склаўся ў Слуцку. У Мінску ў сценах мужчынскай гімназіі аб’яднанне моладзі ўтварыліся дзякуючы Карусю Каганцу. Вядомымі ўдзельнікамі гуртка былі браты Луцкевічы. Акрамя культурніцкай працы на карысць беларушчыны, члены суполкі разам з іншымі народнікамі абмяркоўвалі сацыяльныя і палітычныя пытанні.

Як вынік, у 1902 годзе ўтвараецца першая беларуская палітычная партыя – Беларуская рэвалюцыйная грамада, з 1903 года – Беларуская сацыялістычная грамада. Ля вытокаў грамады стаялі Антон і Іван Луцкевічы, якія ў 1902 годзе ў Пецярбурзе стварылі гурток па вывучэнні Беларусі. У праграме партыі дэкларавалася неабходнасць ліквідацыі самадзяржаўя, прысутнічалі патрабаванні дэмакратычнага і сацыяльнага характару.

“Нашаніўскі” перыяд пачынаецца з 1906 года са з’яўленнем знакавага для беларускай гісторыі і культуры выдання – першай легальнай беларускай газеты “Наша Ніва”. Як друкаваны орган БСГ газета займалася асвятленнем сацыяльных і палітычных пытанняў, але пры гэтым дала моцны штуршок далейшаму развіццю беларускай культуры. Асаблівасцю агітацыі сярод сялянскага насельніцтва з боку інтэлігенцыі быў акцэнт на сацыяльную справядлівасць і роўнасць і ў меншай ступені – на культурны і нацыянальны прыгнёт. Нават адзін з пачынальнікаў беларускага нацыянальнага руху Антон Луцкевіч крытыкаваў нацыяналізм як адмоўную з’яву, маючы на ўвазе шавіністычнае стаўленне да прадстаўнікоў іншых народаў [3, с. 5].

Завяршае стадыю набыцця грамадзянскіх правоў і палітычнага самакіравання перыяд станаўлення дзяржаўнасці. 1918–1919 гг. – вызначальныя ў гісторыі беларусаў, бо менавіта ў гэты час былі абвешчаны БНР, а пасля і БССР. Нацыянальна-культурнае адраджэнне было ў цэнтры ўвагі як прыхільнікаў Беларускай народнай рэспублікі, так і савецкай улады. Разгортвалася актыўная культурна-асветніцкая, выдавецкая, адукацыйная дзейнасць. У 1918 годзе ў Маскве Белнацкамам быў створаны Беларускі народны ўніверсітэт, дзе чыталіся лекцыі па беларускай гісторыі, мове, літаратуры, эканоміцы, геаграфіі і гэтак далей [2, с. 230–231]. Лекцыі наведвалі пераважна настаўнікі. Менавіта яны, як выхадцы з народнага асяроддзя, носьбіты высокай культуры, сталі першай генерацыяй беларускай інтэлігенцыі.

Такім чынам, важнае значэнне на другой стадыі нацыятворчасці мае *палітычны* аспект сацыякультурнага развіцця. З’яўленне беларускіх суполак на абшарах Расійскай імперыі аб’ядноўвала інтэлігенцыю і спрыяла іх культурнай і асветніцкай дзейнасці. У ходзе палітычнай агітацыі, акрамя патрабавання аўтаноміі беларускіх земляў, што прывяло ў рэшце рэшт да з’яўлення беларускай дзяржаўнасці, гучалі заклікі да сацыяльнай эмансіпацыі беларусаў, прадастаўлення ім роўнасці з іншымі народамі і класамі.

**Станаўленне сучаснага беларускага грамадства на фоне здабыткаў і страт.** Стварэнне завершанай сацыяльнай структуры (стадыя C) рэалізуецца ў кантэксце БССР. На гэтай стадыі вылучаюцца *перыяд беларусізацыі, перыяд стагнацыі нацыятворчых працэсаў, перыяд “пабудовы сацыялізму”, перыяд перабудовы і перыяд незалежнага існавання.*

Першы перыяд трэцяй стадыі цягнецца ад абвяшчэння рэспублікі да 1930 года – пачатку справы “Саюза вызвалення Беларусі”. Услед за дзеячамі БНР прадстаўнікі беларускай савецкай улады былі вымушаны прызнаць акрамя сацыяльнага і палітычнага яшчэ і нацыянальна-культурны прыгнёт беларусаў на працягу папярэдніх стагоддзяў. Адметнасцю гэтага часу становіцца палітыка культурнага будаўніцтва – беларусізацыя. Практычнымі захадамі ў галіне дадзенай палітыкі з’яўлялася арганізацыя школ, сярэдне-спецыяльных і вышэйшых устаноў адукацыі з беларускай мовай навучання, развіццё літаратуры, кнігавыдавецтва, навукова-даследчая праца па вывучэнні Беларусі, вылучэнне беларусаў на кіруючыя пасады, перавод справаводства на беларускую мову [4, с. 217]. Нацыянальная культура пачынае выконваць важныя сацыяльныя функцыі.

Палітыка беларусізацыі пазітыўна ўздзейнічала на развіццё амаль усіх відаў мастацтва. Разам са старэйшым пакаленнем літаратараў (Я. Купалам, Я. Коласам, М. Гарэцкім, З. Бядулем) працавала і малодшае (П. Броўка, У. Дубоўка, М. Лынькоў, М. Чарот і іншыя), развіваліся тэатр, выяўленчае мастацтва, музыка. Такім чынам, пасля набыцця дзяржаўнай суб’ектнасці палітычная дзейнасць і агітацыя ў беларускім асяродку адыходзяць на другі план. Існаванне Беларускай савецкай

Рэпазіторый ВДУ

сацыялістычнай рэспублікі дазволіла распачаць пабудову беларускага культурніцкага жыцця пры ўдзеле дзяржаўных структур. У гэтыя перыяд складаюцца найбольш спрыяльныя ўмовы для ўзмацнення *духоўнага* аспекта сацыякультурнага развіцця, але на непрацяглы перыяд. Развіццё кнігавыдання, друку, адукацыі на роднай мове, стварэнне грамадскіх аб'яднанняў стымулявалі *сацыяльны* аспект сацыякультурнага развіцця, дазвалялі адчуць грамадзянам краіны сваю самасць і адначасова пачаць усведамляць сваю прыналежнасць да адзінага сацыяльнага цэлага.

Другі перыяд (стагнацыя нацыятворчых працэсаў) трэцяга этапу пачынаецца з 30-х гадоў і ўключае ў сябе час Вялікай Айчыннай вайны: адбываецца рэзкае запавольванне беларускага культурнага жыцця, спыняецца НЭП, ажыццяўляецца гвалтоўная калектывізацыя. У кіруючай эліце БССР перавагу набываюць дзеячы з іншых рэспублік. Ціск з боку ўлады і рэпрэсіі прыводзяць да парушэння сацыяльных сувязяў. Падчас справы "Саюзу вызвалення Беларусі" было асуджана шмат дзеячаў беларускай навукі і культуры. Многія з іх загінулі ў перыяд рэпрэсій, асабліва ў 1937–1938 гадах. У адпаведнасці з ідэалагічнымі патрабаваннямі мусілі працаваць дзеячы музычнага і выяўленчага мастацтва, кіно. Галоўным творчым метадам афіцыйна быў прызнаны сацыялістычны рэалізм, асвятленне пралетарскага жыцця. Перыяд Другой сусветнай вайны прывёў да яшчэ большага замаруджвання эканамічнага, дэмаграфічнага і іншых працэсаў. Такім чынам, другое дзесяцігоддзе існавання Беларусі ў кантэксце Савецкага Саюза прыносіць сур'ёзныя страты як працэсам нацыятворчасці, так і ўсім аспектам сацыякультурнага развіцця. Краіна канчаткова адрываецца ад этнічнага нацыябудаўнічага праекта, які быў распрацаваны беларускімі культуратворчымі элітамі на пачатку стагоддзя. Накірункі яе развіцця падпарадкоўваюцца інтарэсам саюзнага цэнтра, планамерна праводзіцца ў жыццё палітыка "інтэрнацыялізму".

Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны Беларусь уступае ў перыяд "пабудовы сацыялізму", які напачатку характарызуецца паскарэннем індустрыялізацыі і ўрбанізацыі ў межах рэспублікі. Гэта прывяло да істотных змен у сацыяльнай структуры грамадства, яго культурных характарыстык. На працягу ўсяго азначанага перыяду *эканамічны* аспект сацыякультурнага развіцця меў найбольш выразны характар. Пад яго ўплывам сацыяльны аспект набыў тыя змены, наступствы якіх мы можам назіраць і сёння. Да 70-х гадоў пераважная большасць жыхароў краіны пражывала ў сельскай мясцовасці. Былыя жыхары вёскі ў горадзе былі вымушаны адмаўляцца ад традыцыйнай народнай культуры, спяшаючыся прыняць гарадскія правілы і нормы паводзін, мову. Менавіта ў гэты час сярод жыхароў Беларусі пачынае пашырацца ўяўленне аб прыналежнасці іх да пэўнай сацыяльнай агульнасці, "уяўнай супольнасці", культура якой была савецкай па форме і змесце. У рэчышчы развіцця духоўнага аспекту трэба назваць развіццё як прафесійнай, так і аматарскай творчасці, стварэнне творчых саюзаў, з'яўленне шэрага выдатных прафесійных пісьменнікаў, мастакоў, музыкантаў (пісьменнікі П. Броўка, І. Мележ, М. Танк; драматургі А. Макаёнак, А. Дудараў; кампазітары Ю. Семяняка, Г. Вагнер, Э. Ханок; мастак Ю. Савіцкі). Нягледзячы на значныя дасягненні ў мастацкай творчасці ў рэчышчы беларускай нацыянальнай культуры (І. Мележ, У. Караткевіч), у гэты перыяд пачало складацца тыповае для беларускіх рэалій стаўленне да нарожанасцю культурнай спадчыны: яна ўспрымаецца як важны здабытак, адметная рыса беларускага народа, але ў штодзённым жыцці не мае значных сацыяльных функцый. Савецкая рэчаіснасць з насцярожанасцю ставілася да выяўлення нацыянальных пачуццяў і адметнасцей. Такое становішча спрыяла асэнсаванню ў інтэлектуальнай прасторы гістарычнага лёсу беларускай нацыі ўскоснымі сродкамі, напрыклад праз мастацкую літаратуру. У. Караткевіч у рамане "Каласы пад сярпом тваім" (1962–1964) адлюстраваў удзел у нацыятворчых працэсах не толькі народных нізоў, але і мясцовай эліты (шляхты).

Такім чынам, у перыяд "пабудовы сацыялізму" фарміруецца тая канфігурацыя сацыякультурнай сітуацыі, якая мае свой уплыў і па сённяшні дзень. Асобныя адміністратыўныя межы рэспублікі, яе кіраўніцтва, інстытуялізаваныя формы стварэння, захавання, трансляцыі і спажывання культурнага прадукту, адносны дабрабыт на фоне актыўнага развіцця эканомікі сфарміравалі ў насельніцтва Беларусі ўсведамленне сваёй дзяржаўнай прыналежнасці, сацыяльную і культурную тоеснасць.

У пасляваенныя дзесяцігоддзі палітычнаму аспекту сацыякультурнага развіцця адводзілася пераважна другасная роля. Ва ўмовах жорсткай цэнтралізаванай улады актыўная палітычная дзейнасць была не толькі не заўсёды мэтазгоднай, а часам і небяспечнай. Істотныя змены пачаліся ў перыяд перабудовы, калі палітычныя патрабаванні звязваліся з пытаннямі духоўнага і нацыянальнага адраджэння. Новаўтвораныя палітычныя сілы выступалі за адраджэнне беларускай культуры, незалежнасць краіны і дэмакратызацыю ўлады.

Стадыя стварэння завершанай сацыяльнай структуры адзначаецца складанасцю і неадназначнасцю нацыятворчых працэсаў, што прадыктавана цяжкасцю гістарычнага лёсу ў XX стагоддзі як Беларусі, так і ўсяго свету ў цэлым. З аднаго боку, наша краіна атрымала дзяржаўнасць, што ў сённяшніх умовах з'яўляецца вызначальным фактарам сацыякультурнага развіцця грамадства. З другога – палітычныя і ваенныя катаклізмы першай паловы XX стагоддзя, вынішчэнне

Рэпазіторый ВДУ

культуратворчай эліты, абмежаванне ролі нацыянальнай культуры ў жыцці грамадства замарудзілі нацыятворчасць, а таксама працэс стварэння, захавання, распаўсюджвання, трансляцыі і засваення ўласнанацыянальнага беларускага культурнага вопыту. Пасля развалу СССР для Беларусі пачынаецца перыяд незалежнага існавання, вынікам якога павінна стаць яе максімальнае сацыякультурнае развіццё ва ўсіх аспектах.

**Заключэнне.** Працэс станаўлення беларускай нацыі ў XIX–XX стагоддзях ажыццяўляецца ў межах агульнаеўрапейскіх тэндэнцый, але мае шэраг сваіх выразных адметнасцей. Беларуская нацыянальная ідэя пачынае выспяваць у рэчышчы польскага краёвага патрыятызму – першымі звярнулі ўвагу на культуру беларускага народа як самастойную з'яву менавіта навучэнцы віленскага ўніверсітэта. У далейшым, дзякуючы навуковай дзейнасці "заходнерусістаў" і "краёўцаў", было назапашана шмат матэрыялаў па культуры беларускіх земляў, у тым ліку па мове. Гэта паўплывала на станаўленне беларускай літаратуры. Такім чынам, на першай стадыі нацыятворчых працэсаў галоўнай сілай, якая рухала сацыякультурнае развіццё на Беларусі, была цікавасць да духоўнай спадчыны народа. Актыўнае палітычнае жыццё ў апошняй чвэрці XIX стагоддзя, удзел беларусаў у грамадскіх аб'яднаннях паспрыялі крышталізацыі ідэі аб неабходнасці аўтаноміі беларускіх земляў, што з'яўляецца асноўным кампанентам у структуры нацыянальнай ідэі. Менавіта палітычная дзейнасць на другой стадыі нацыятворчасці садзейнічала кансалідацыі беларускай інтэлігенцыі, інстытуалізацыі творчых і грамадскіх структур. Дадзены этап заканамерна заканчваецца набыццём беларускай дзяржаўнасці. Стварэнне завершанай сацыяльнай структуры (апошняя стадыя нацыятворчасці) напачатку было адметна ўзмацненнем духоўнага і сацыяльнага аспектаў сацыякультурнага развіцця, дзякуючы падтрымцы дзяржаўных структур. Аднак падзеі 30-х гадоў і Другой сусветнай вайны знішчылі шмат дасягненняў беларускага нацыянальнага будаўніцтва першых гадоў існавання нашай краіны ў кантэксце СССР. Пасля вайны эканамічны рост вызначаў культурную і сацыяльную канфігурацыю рэспублікі. Адметнасцю перыяду "развіцця сацыялізму" нацыятворчых працэсаў у Беларусі з'яўляецца невысокая палітычная актыўнасць. Аднак сітуацыя істотных пераўтварэнняў у апошнія гады існавання Савецкага Саюза спрыяла ўзмацненню цікавасці да палітычных пытанняў, была цесна звязана з культурным аспектам сацыякультурнага развіцця.

### ЛІТАРАТУРА


1. Андерсон, Б. Нации и национализм / Б. Андерсон [и др.]. – М.: Праксис, 2002. – 416 с.
2. Лыч, Л. М. Гісторыя культуры Беларусі / Л. М. Лыч. – Мінск: Экаперспектыва, 1997. – 487 с.
3. Геллнер, Э. Нации и национализм / Э. Геллнер. – М.: Прогресс, 1991. – 320 с.
4. Беларуская думка XX стагоддзя: Філасофія, рэлігія, культура: Анталогія / Пол. акад. навук, Ін-т славістыкі; уклад., прадм., апрац. Ю. Гарбінскага. – Варшава: ІС ПАН, 1998. – 741 с.
5. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2000–2008. – Т. 5: Беларусь у 1917–1945 гг. / [А. Вабішчэвіч [і інш.]; рэд. тома: М. Касцюк]. – 2006. – 615 с.


*Паступіў у рэдакцыю 04.10.2016 г.*

Рэпазіторый ВДУ